*Ю. С. Барадзін,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,*
*г. Мінск*

# МАГІЯ СВЕТУ РАСЛІН У ДЗЕЙНАСЦІ ГЕРОЯЎ БЕЛАРУСКАГА І СКАНДЫНАЎСКАГА ПАНТЭОНУ

У міфалагічных уяўленнях індаеўрапейцаў магія свету раслін займае важнае месца. Роля лекавых раслін у язычніцтве паспрыяла міфалагізацыі расліннага свету беларусаў і скандынаваў. Расліны звязаны як з урадлівасцю, так і з жыццём і народнай медыцынай. Чалавек, адчуваючы сябе часткай расліннага свету, здольны быў валодаць магічнай сілай, незвычайнымі ведамі і таямніцамі і бачыць сябе роўным прыродзе.

Магічныя расліны выкарыстоўваліся ў скандынаўскай медыцыне, і, мяркуючы па скандынаўскіх сагах і песнях «Старэйшай Эды» [5] і «Малодшай Эды» [6], у скандынаўскіх народаў было мноства ведаў, каб дасягнуць неверагодных вынікаў.

У германа-скандынаўскай міфалогіі паведамляецца, што багі і героі карысталіся рознымі лекавымі раслінамі. Для лячэння хворых і параненых у баі ў медыцыне вікінгаў ужывалі травы [5, с. 35]. Адна з траў, якую жыхары Ісландыі і Грэнландыі называлі лячэбнай фіялкай, – трава багіні дзетараджэння і жонкі Одзіна Фрыг. З гэтай травы гатавалі розныя лекі і любоўныя напоі, з дапамогай якіх мужчына і жанчына маглі закахацца [2, с. 125].

Рамонкі ў скандынаўскіх сагах – лекавыя кветкі, унутры якіх магутнасць бога вясны Бальдра, сына Одзіна і Фрыг, і багіні любові Фрэйі, дачкі бога-вана Ньёрда [6, с. 48]. Папараць-кветку параўноўвалі з яе валасамі [3, с. 25]. Многія кветкі і расліны называюць вейкамі Бальдра [6, с. 46], вейкамі Фрэйі і травамі Фрыг. Расліны «Шлем Цюра» [Там жа, с. 49] (заступніка скандынаўскіх ваяроў, іх смеласці і годнасці) і «Шлем грамабоя Тора» (уладальніка молата «М’ёльнір») [Там жа, с. 45] здольныя ў міфах вікінгаў залячыць небяспечныя раны, нават, калі яны нанесеныя драпежным зверам, накшталт ваўка [3, с. 26]. З дапамогай кары дуба, якая была ў скандынаваў адной з лекавых раслін, вікінгаў лячылі ад цяжкіх захворванняў, як дыярэя, боль у страўніку. Скандынаўская цыбуля, якая называ-

лася «парэй», унутры з цыбулінамі часнаку, таксама выганяла хваробу. Вярхоўны бог вікінгаў і скандынаваў – Усебацька Одзін ужываў такую магічную расліну, як «Шып сну», дзеля таго, каб усыпіць іншых багоў, багінь і валькірый, што забіралі душы загінуўшых ваяроў з поля бою ў Вальхалу [6, с. 44].

Падобна язычніцкім рунам [2, с. 131], зробленым у гонар пантэону багоў вікінгаў, скандынаўскія расліны давалі хвораму ці параненаму сілы і здароўе [5, с. 70], вярталі да жыцця, нават калі не было надзеі. Выкарыстоўвалі вікінгі «Траву жыцця», высока ацэньвалі яе і лічылі, што з яе дапамогай можна дасягнуць неверагодных вынікаў, напрыклад залячыць цяжкія і смяротныя раны, нанесеныя зброяй ворага ў баі, зрошчваць адсечаныя канечнасці цела [6, с. 59].

Жыранкай у медыцыне вікінгаў лячыліся ад кашлю і прастудных захворванняў. Магія і чараўніцтва існуюць таксама ў легендарным «Лузе неўміручасці» (ісландскі варыянт маладзільных яблык багіні вечнай маладосці – Ідун), якія згодна з легендамі і міфамі падаўжаюць чалавеку маладосць. Разрыўтрава – частка магіі скандынаўскага свету раслін, з яе дапамогай у легендах, палонны мог разбіць кайданы і вызваліцца з палону [3, с. 28].

Паколькі сярод вікінгаў былі запальчывыя «берсэркі», іх частавалі такой стравай як «суп з мухамораў», пад уплывам якога берсэрк ішоў без страху на вайну, вар'яцеў падчас бітвы, кусаючы зубамі шчыт праціўніка, працягваючы змагацца, нават калі паранены [4, с. 139].

Расліны і травы адыгрывалі важную ролю ў жыцці як скандынаваў, так і іх пантэону багоў у язычніцкай культуры. Яны маглі самастойна рухацца, размаўляць, як людзі, і камунікаваць з багамі. Многія з раслін – сімвалы і абярэгі багоў. Аднак некаторыя з раслін багоў адыгралі дрэнную ролю ў будучыні. Напрыклад, ведаючы наперад аб наканаванай пагібелі Бальдра, багіня Фрыг спрабуе любымі намаганнямі выратаваць сына. Згодна з яе воляй і жаданнем амаль усе расліны прыносяць ёй клятву – аберагаць і ніколі не шкодзіць богу вясны. За выключэннем атрутнай расліны – амелы, з якой Фрыг забыла узяць клятву, і якую атручвае бог агню і падману Локі [3, с. 58]. Падступны бог забівае Бальдра амелай, укладзенай у рукі сляпога Хёда, зрабіўшы, такім чынам, апошняга братазабойцам. Амела

ў скандынаўскіх міфах адыгрывае ракавую ролю, паколькі смерць Бальдра – гэта пачатак канца старога свету скандынаваў і гібелі многіх з багоў. Локі валодае наркатычнай раслінай для хітрасці і маніпуляцыі над багамі «грымок малы» [3, с. 59].

У пантэоне скандынаўскіх багоў ёсць і тыя, хто мае заступніцтва над лячэннем. Адна з іх – служанка багані Фрыг – багіня Эйр, якую называюць адной з валькірый («Старэйшая Эда» Снора Стурлусана), кажучы, што ніхто так не лечыць хворых ці параненых багоў, як яна. У гонар багіні Эйр вікінгі праводзілі язычніцкія рытуалы і ўзносілі ахвярапрынашэнні, верылі ў яе дапамогу хвораму ці падтрымку [6, с. 58].

Ідун – дачка карліка Івальдзі, жонка заступніка скальдаў (паэтаў) Брагі, працягвае з дапамогай яблыкаў жыццё і маладосць скандынаўскім багам і багіням, бо яны смяротныя, як людзі [Там жа, с. 50].

З скандынаўскага пантэону багоў вызначаюцца адначасова багі помсты і раслін: Валі – сын вярхоўнага Одзіна і волаткі Рынд, бог, які адразу пасля нараджэння адпомсціў сляпому Хёду за забойства бога вясны Бальдра, кіруе раслінамі і прыродай; другі бог помсты – Відар, сын Одзіна і волаткі Грыд, які ў будучыні ў дзень фінальнай бітвы «Рагнарок» адпомсціць пачварнаму ваўку Фенрыру за забойства бацькі, ён таксама з'яўляецца богам сіл прыроды, аднаўлення і адраджэння ў расліннасці. Бог вясны Бальдр і бог лета і сонца Фрэйр – багі ўрадлівасці, бо спрыяюць прыходу добрага ўраджаю ў полі, міру і прыгажосці ў прыродзе. Прырода і расліны – частка зямлі, якой кіруюць Ёрд – жонка Одзіна і маці грамабоя Тора. Адна з наймагутнейшых раслін у скандынаўскай міфалогіі – апорны стрыжань, на якім трымаецца свет вікінгаў, – дрэва «Ігдрасіль» [Там жа, с. 37]. Пасля фінальнай бітвы Рагнарок дрэва ўпадзе, і стары свет скандынаваў згарыць у агні пажару волата Сурта, разам з ім загінуць і сённяшнія прырода з раслінамі. Як толькі народзіцца новы скандынаўскі свет, а Бальдр і яго брат Хёд уваскрэснуць і вернуцца з змрочнага валадарства Хель, з імі ў новым свеце будуць кіраваць раслінамі і прыродай тыя багі, якія ацалелі, – Валі і Відар.

Да таго часу, пакуль не настане скандынаўская эсхаталогія, а космас зноў не вернецца ў часовыя цемру, змрок і хаос, калі не было нічога, акрамя пустэчы, частка скандынаўскіх раслін

у сучасным свеце скандынаваў утварылася з пасечаных частак волата Іміра, якога забілі стваральнікі космасу – вярхоўны Одзін і яго браты Велі і Ві. З мяса забітага волата створана зямля, з касцей – горы, і з валасоў – расліны. З раслін-дрэў багі стварылі чалавека. З ясеня – мужчыну, з алешыны – жанчыну. Ёсць і расліны ў частках свету, якім кіруюць скандынаўскія багі. Напрыклад, у палацы «Фолькванг» багіні любові Фрэйі ёсць галоўная зала «Сесрумнір» (народнае поле) [Там жа, с. 49], бо Фрэйя адказвае за ўраджай і жніво. Альбо «Жалезны лес» – частка Ётунхейма – свету волатаў і пачвараў – ворагаў багоў, дзе ётуны жывуць у выглядзе ведзьмаў-чараўніц і драпежных ваўкоў [Там жа, с. 86]. Прыродная раўніна «Вігрыд» – будучае месца для апошняй бітвы паміж багамі і ётунамі [Там жа, с. 87].

Беларуская міфалогія не менш багатая раслінамі. Пэўныя віды раслін існуюць у беларускім язычніцкім пантэоне. Замагільны свет беларусаў «Вырай», куды адлятаюць душы памерлых у выглядзе птушак, поўны прыгажэйшых дрэў і раслін. Беларускі «Вырай» і замагільны агульнаславянскі «Ірый» называюць райскім садам славян.

Акрамя беларускіх багоў, функцыі кіравання раслінамі выконваюць духі, якія адносяцца да ніжэйшай міфалогіі – дэманалогіі. Дух лесу Лесавік, альбо Лясун – вартаўнік лясной прыроды, ён сочыць за парадкам і можа пакараць шкоднікаў лесу, каб тыя заблукалі ў лесе і не вярнуліся [4, с. 10]. Полем, дзе растуць каласы, кіруе дух Палявік. Русавы Дзед і Жалезная Баба (Русаўка) – духі-захавальнікі жытняга поля. У палях і агародах дбаюць аб раслінах Цётка – жонка Перуна і багіня лета і Жыцень – бог восені [1, с. 70]. Бялун, якога ў беларускіх міфах называюць Белбогам, стварае багаты ўраджай жыта, і так жа клапоціцца пра прыроду. Пасля зімы, калі пачынае таяць снег, бог вясны Ярыла адмыкае зямлю і спрыяе таму, каб выраслі кветкі і разам з травой шмат іншых раслін [Там жа, с. 60]. Розны выгляд кветак, пачынаючы ад дзьмухаўцоў, ружаў і рамонкаў, прыносіць маладая багіня вясны Лёля – дачка багіні кахання Лады [Там жа, с. 69]. Пярун з дапамогай маланак і грому, якімі выклікае дождж на зямлі, дапамагае таму, каб зямля не была пустой і расло шмат раслін [Там жа, с. 58]. Не меншую ролю адыгрывае ў гэтым кіруючы сонцам Дажбог –

сын каваля-Сварога [Там жа, с. 57]. З багінь жаночага полу старанна дбае пра зямлю і ўраджай Мокаш – багіня лёсу [Там жа, с. 65].

Дрэва з'яўляецца адным з найстаражытнейшых сімвалаў як у скандынаўскай, так і ў беларускай міфалогіях. Само дрэва звязана з шанаваннем прыроды. Адны з распаўсюджаных дрэў – бяроза і дуб [4, с. 12]. Продкі беларусаў лічылі, што дрэва абараняе чалавека ад хвароб, усяго злога і ратуе ад варожай сілы. Прадстаўлялі дрэвы ў выглядзе волатаў. Многім старажытным беларускім дрэвам больш за 100 гадоў. Высякаць іх лічыцца злачынствам супраць самога сябе, бо ў дрэве захоўваецца магія расліннага свету. Дрэвы па сённяшні дзень з'яўляюцца гарантам жыцця чалавека і прыроды. Яны здольныя адчуваць боль і раны з крывёю так, як і людзі, паколькі дрэвы – частка жывой прыроды. У міфалогіі беларусаў, як і ў скандынаваў, ёсць міфалагічнае дрэва свету, на якім трымаецца ўвесь космас. Аднак, паколькі звесткі пра яго не захаваліся, беларускае дрэва сусвету ў адрозненне ад скандынаўскага імя не мае. Пры гэтым ні само беларускае дрэва, ні беларускія расліны не асуджаныя на эсхаталогію і пагібель, як у германа-скандынаўскай бітве «Рагнарок». Менавіта дуб у беларускай міфалогіі разглядаецца як Сусветнае дрэва, вакол каранёў якога хаваецца Змей, а ў скандынаўскай міфалогіі вікінгаў грызе карані дрэва «Ігдрасіль» змей Нідхёг. Таксама, як Сусветнае дрэва, у беларускай міфалогіі апісваюцца яблыня, клён і явар [1, с. 189].

У міфалогіі беларусаў ёсць таксама дрэвы з адтулінамі, якія лічацца лекавымі. З дапамогай адтуліны ў ствале найчасцей лячылі хворага. У народнай медыцыне выкарыстоўвалі кару розных дрэў, напрыклад, дуба, сасны, ліпы, грушы [Там жа, с. 183]. Дуб з часоў язычніцтва лічыцца сімвалам вечнасці і бясконцага жыцця. Продкі беларусаў ушаноўвалі дубы, як багоў, праз язычніцкія абрады з бяскроўнымі ахвярапрынашэннямі, што зафіксавана яшчэ за некалькі тысячагоддзяў да нашага часу. З-пад старажытных дубоў выцякалі крыніцы, з дапамогай якіх людзі лячылі вочы і інш. Таксама каля дуба праводзілі вясельны абрад, вянчанне маладой пары. Вакол дуба людзі ладзілі карагод і танчылі народныя танцы. Каб захаваць здароўе і не хварэць, дрэва альбо трэслі, альбо церліся аб яго. Дуб – галоў-

нае дрэва ў беларусаў, якое суадносілася ва ўсіх славянскіх народаў і плямён з богам-грамабоем Перуном [4, с. 13].

Сасна, як і дуб, займае галоўнае месца сярод лекавых дрэў, адыгрывае ролю ў захаванні космасу (свету). Галінкі сасны жыхары забіралі дадому, каб не стаць выпадковымі ахвярамі навальніцы, маланкі і грому. Каля сасны праводзілі абрады жаніцьбы.

Падобна дубу і сасне, ліпа і бяроза таксама лічыліся магічнымі дрэвамі-ахоўнікамі, што дапамагаюць і лечаць ад хвароб, абараняюць ад злых духаў і нячысцікаў. Бярозы дапамагалі жанчынам, якія не маглі зацяжарыць альбо нарадзіць дзіця.

Беларускім варыянтам скандынаўскай багіні маладосці захавальніцы маладзільных яблык Ідун выступае яблыня, якую называюць дрэва-маці. Яблыкі адыгрывалі значную ролю ў цяжарнасці жанчыны перад дзетараджэннем і ў шлюбе з мужчынай. Беларускія яблыкі, як і яблыкі Ідун, вярталі чалавеку здароўе, сілу і маладосць [1, с. 189].

Плады грушы, падобныя на яблыкі, пасля з’ядання дапамагаюць зацяжарыць жанчыне [Там жа, с. 190].

З магічных раслін у беларускай міфалогіі вызначаецца вярба, якая ўзгадваецца ў фальклоры, адраджае прыроду. Захоўваюцца і старажытнаязычніцкія абрады адраджэння беларускай прыроды, напрыклад Вербная нядзеля. Вярба – дрэва багіні любові і ўрадлівасці Лады, лічылася, што яна дапамагае чалавеку ад няўпэўненасці і баязлівасці, лечыць ад страху [Там жа, с. 321].

Папараць-кветка – магічная расліна ў беларускіх міфах, якая дапамагала продкам беларусаў падтрымліваць сувязь і агульную мову з жывой прыродай, часткі якой – розныя расліны, дрэвы, птушкі і жывёлы. У беларускім фальклоры папараць-кветка прызнана кветкай, якая лечыць ад розных небяпеспечных хвароб, дапамагае убачыць будучыню. Па сённяшні дзень беларусамі выкарыстоўваецца яна падчас старажытна-язычніцкага абраду «Купалле» і ўспрымаецца як магутная зброя супраць злой, нячыстай сілы, накшталт, чорта з дэманалогіі. З папараць-кветкі дзяўчаты ў купальскім абрадзе плятуць вянкі, затым кідаюць іх у раку, захоўваючы веру ў шчасце ў жыцці [Там жа, с. 200].

І. Клімковіч і Л. Дучыц у навуковым творы «Язычніцтва старажытных беларусаў» даследавалі, што з часоў глыбокай ста-

ражытнасці такія расліны, як кветкі, травы, зёлкі, валодаюць лекавымі і магічнымі ўласцівасцямі. Сярод зёлак яны ўзгадваюць такую расліну, як ключыкі (з яе гатуюць зелле і магічныя лекі). Кветкі, якія называлі валошкамі, звязвалі з богам жывёлагадоўлі Вялесам [Там жа, с. 196]. Валошкі, згодна з даследаваннямі І. Клімковіч і Л. Дучыц, клалі ў труну памерлага падчас пахавання. А кветка носіць імя героя Васілька, якога русалка на русальным тыдні пераўтварыла ў расліну. Купальскія травы – самыя лекавыя і магічныя зёлкі, з якіх плялі вянкі для здароўя і дабрабыту як людзей, так і жывёл. Трыпутнік – адна з купальскіх кветак, якая дапамагае дзяўчыне знайсці будучага жаніха [Там жа, с. 197]. Барвінак (барлінак, барлінец) і рута выкарыстоўваліся падчас абраду жаніцьбы, калі плялі вянок для нявесты і будучай жонкі [Там жа, с. 203].

Першапачатковая назва лекавай кветкі дзьмухаўца – багатка, якой лячылі бацькоў і дзяцей.

Такая зёлка, як святаяннік, з якой гатавалі святаянскае зелле, ужывалася ў якасці магічнага абярэгу ад нячыстай сілы, каб зберагчы родны дом і сям'ю. Падобную раслінную магію ў беларусаў паўтараюць купальскія травы – баркун (доннік), тоя (рагулькі, казялкі), зберагаючы людзей ад небяспекі. З дапамогай гэтых кветак бацькі маглі ўратаваць дзіця ад пакутнай смерці.

Падобную ролю папараць-кветкі ў магічным свеце раслін адыгрываюць разрыў-трава, сон-трава і жабер-трава [Там жа, с. 201]. Папараць-кветка, паводле даследаванняў, лічыцца падарункам бога вясны Ярылы. Разумеючы яе здольнасць да незвычайных цудаў, магічную кветку шукаюць, як людзі, так і нячыстыя сілы, варожыя пантэону беларускіх багоў. Разрыў-трава спрыяе пошуку незвычайных скарбаў, якія прынясуць шчасце беларусам, а яе здольнасць падуладная такім птушкам, як сойка, сарока, сава, дзяцел. Сон-трава можа наслаць сон на ўсё жывое, у тым ліку на людзей, жывёлу, прыроду ў цэлым. Жабер-трава дае чалавеку веды і незвычайныя магчымасці для дасягнення поспехаў [Там жа, с. 288].

У беларускім фальклоры захоўваюцца і старажытна-язычніцкія абрады, звязаныя з ушанаваннем магічных раслін і жывой прыроды. Напрыклад, падчас гукання вясны міфічную істоту Вясноўку ўпрыгожваюць кветкамі, затым спяваючы вяс-

новыя песні, нясуць яе па палях [Там жа, с. 269]. Адным з веснавых свят, адначасова прысвечаных культу раслін, з'яўляецца Вербная нядзеля. Сам жа Вялікдзень, яшчэ да таго, як стаў у хрысціянстве святам Пасхі і ўваскрэсення Ісуса Хрыста, у язычніцкія часы разглядаўся як абрад, звязаны з абуджэннем прыроды [Там жа, с. 273]. Адзін з архаічных абрадаў у Беларусі – «Ваджэнне і пахаванне стралы» з элементамі магіі для ўмацавання ўрадлівасці, абароны ад пажараў і смерці праз грамавыя стрэлы [Там жа, с. 330]. Магічныя песні спяваюцца і ў абрадзе «Ваджэнне куста», калі дзяўчыну пераапранаюць у расліны з лісця. Падчас Траецкіх дзядоў упрыгожвалі магілы нябожчыкаў зелянінай. Вясновы абрад «Бабы» лічыўся толькі жаночым [Там жа, с. 279]. Ёсць і свята адначасова ў гонар жніва і месяца жніўня – Дажынкі [Там жа, с. 293]. Абрад выклікання дажджу – адзін з распаўсюджаных для магічнага свету раслін, бо дождж умацоўвае урадлівасць і прыроднае багацце [Там жа, с. 329]. Дзякуючы клопату Ярылы аб прыродзе на зямлі з'яўляюцца кроплі празрыстай вады, што называюцца расой.

Больш распаўсюджаныя ў беларускай міфалогіі лекавыя замовы продкаў, якімі карыстаюцца нашчадкі, бо дбаюць пра ўмацаванне здароўя [Там жа, с. 339].

Значную ролю ў жыцці нашых язычніцкіх продкаў адыгрывалі магічныя практыкі ў раслінах, з дапамогай якіх можна ствараць магічныя абрады, аздараўляць хворых, камунікаваць з жывой прыродай, і падтрымліваць дыялог з язычніцкім пантэонам багоў. Верылі, што расліны здольныя напалохаць злую і нячыстую сілу, варожую багам. Продкі сучасных беларусаў і скандынаваў перадалі нашчадкам веды аб тым, што да расліны трэба ставіцца як да жывой істоты, амаль як да баства. У міфалагічным стаўленні да раслін у нашчадкаў вікінгаў, крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў і палачан захавалася павага да свайго язычніцкага мінулага і пакланенне прыродзе, што выразна бачна і адлюстравана ў захаваных магічна-раслінных язычніцкіх і фальклорных абрадах Беларусі і Скандынавіі.

На працягу стагоддзяў лекавыя расліны з'яўляюцца пасярэднікамі паміж людзьмі і багамі. Дрэвы і расліны – такія ж жывыя істоты, як людзі і жывёлы, што здольныя расці, мяняць выгляд, хварэць і аздараўлівацца, адчуваць боль і плакаць. Лічылася, што калі чалавек апаганьвае, псуе альбо забівае расліну

праз яе зрыванне з зямлі разам з каранямі, ці высякае дрэвы, што забаронена ў народнай медыцыне язычніцкіх народаў, то падобнымі дзеяннямі ён на сябе наклікае гнеў і праклён пантэону багоў, невылечныя хваробы і помсту прыроды. Дрэвы і расліны ўспрымаліся як стрыжань, што аб'ядноўвае людзей з розных народаў і іх язычніцкія пантэоны шматбожжа.


*1. Дучыц, Л.* Язычніцтва старажытных беларусаў / Л. Дучыц, І. Клімковіч. – Мінск : Харвест, 2014. – 368 с.

*2.* Каханне. Смерць. Пачвары: скандынаўскія народныя балады / пер. са швед., дацк., нарвеж., фарэр., ісланд., норн Я. Папакуля. – Мінск : Тэхналогія, 2024. – 148 с.

*3.* Наследники Одина. Предания скандинавских народов средневековой Европы. – СПб. : Азбука-Аттикус, 2016. – 288 с.

*4. Ненадавец, А. М.* Святло таямнічага вогнішча / А. М. Ненадавец. – Мінск : Беларусь, 1993. – 287 с.

*5.* Эда. Песні пра багоў / пер. са старажытнаісл. Я. Папакуля. – Мінск : Галіяфы, 2021. – 312 с.

*6.* Эда Сноры Стурлусана / пер. са старажытнаісл. Я. Папакуля. – Мінск : Галіяфы, 2021. – 298 с.



***Е. В. Елисеенко,***

***Республиканский институт высшей школы,***

***г. Могилев***


## «НАРОДНОЕ РОДОВСПОМОЖЕНИЕ» В МИНСКОЙ ГУБЕРНИИ В НАЧАЛЕ XX в.

Социокультурный контекст организации родовспоможения – важная часть гендерной истории и истории повседневности. Начало XX в. – сложный период в развитии медицинской помощи женщине на белорусских землях, представляющий разные модели родовспоможения, сосуществовавшие одновременно.

Вопросы оказания медицинской помощи женщине находятся в сфере интересов историков, юристов, медиков, этнографов, антропологов. В статье приведены взгляды на проблему «народного родовспоможения» практикующих врачей Минской губернии начала XX в. М. Эйсымонта, М. О. Поляка,